# Прынята дэкларацыя патрыятычных сіл краіны

**На пасяджэнні штаба патрыятычных сіл Рэспублікі Беларусь на базе Нацыянальнай бібліятэкі ў Мінску прынята абноўленая дэкларацыя патрыятычных сіл, паведамляе БелТА.**

Тэкст дэкларацыі зачытаў **старшыня Беларускай партыі «Белая Русь», старшыня РГА «Белая Русь», член Савета Рэспублікі Алег РАМАНАЎ.**

«Год таму мы сабраліся на сцэне Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Я. Купалы і прынялі першую сумесную дэкларацыю. З задавальненнем адзначаем, што яе пункты выконваюцца як самімі ўдзельнікамі таго форуму, так і органамі дзяржаўнай улады. За мінулы час былі прынятыя законы аб Усебеларускім народным сходзе, аб грамадзянскай супольнасці, аб палітычных партыях. У Беларусі паслядоўна ажыццяўляецца ўдасканаленне палітычнай сістэмы. А гэта ўмацоўвае нашу незалежнасць і суверэнітэт», — гаворыцца ў дэкларацыі.

Ужо зусім хутка Беларусь уступіць у пару сур'ёзных выбарчых кампаній. «У лютым 2024 года чакаюцца выбары ў Нацыянальны сход Рэспублікі Беларусь, мясцовыя Саветы, будзе сфарміраваны састаў Усебеларускага народнага сходу. А ў 2025 годзе пройдуць прэзідэнцкія выбары. Мы ўсведамляем, што ў любым грамадстве палітычнае жыццё непазбежна суправаджаецца канкурэнцыяй, сутыкненнем поглядаў і ідэй, барацьбой за галасы выбаршчыкаў. Адначасова ўсе мы зацікаўленыя, каб гэты працэс праходзіў у цывілізаванай форме, не вёў да расколу грамадства, а садзейнічаў яго паступальнаму руху наперад», — падкрэсліваецца ў дэкларацыі.

У сувязі з гэтым грамадска-палітычныя сілы Беларусі пацвярджаюць сваю прыхільнасць да наступных прынцыпаў, якімі будуць кіравацца ў далейшай дзейнасці, у тым ліку ў перадвыбарны перыяд. «Незалежнасць і суверэнітэт з'яўляюцца непарушнай асновай нашага разумення дзяржаўнасці. Канстытуцыя ў рэдакцыі, ухваленай на ўсенародным рэферэндуме 27 лютага 2022 года, вызначае агульнапрызнаныя рамкі айчыннай мадэлі развіцця. Дасягненні перыяду прэзідэнцтва Аляксандра Лукашэнкі задаюць вектар развіцця нашай краіны на многія гады наперад. Дзяржаўны сцяг, Дзяржаўны герб і Дзяржаўны гімн Рэспублікі Беларусь з'яўляюцца свяшчэннымі сімваламі, якія аб'ядноўваюць увесь народ. Беларусь захоўвае вернасць сваім абавязацельствам у Саюзнай дзяржаве, заснаваным на разуменні агульнасці шляху ўсходнеславянскіх народаў, нягледзячы на ўсе нягоды і выпрабаванні. Палітычнае жыццё павінна будавацца ў ключы адкрытай дыскусіі па актуальных грамадска значных пытаннях. Брудныя палітычныя тэхналогіі недапушчальныя падчас выбарчых кампаній, яны супярэчаць самому разуменню грамадскага ладу, уласцівага беларусам. Любое замежнае ўмяшанне ва ўнутрыпалітычныя працэсы краіны з'яўляецца злачынным і павінна цалкам выключацца. Партыі, а таксама асобныя кандыдаты, якія ўдзельнічаюць у выбарах, у сваіх палітычных праграмах павінны кіравацца найперш агульнанацыянальнымі інтарэсамі, не разменьваючы іх на імгненныя прыватныя разлікі. Распальванне якой бы там ні было варожасці ўнутры беларускага грамадства непрымальнае», — адзначаецца ў дэкларацыі.

«Пераканаы, што ўсе мы, народ Рэспублікі Беларусь, дастойна пройдзем адказны палітычны перыяд і прадэманструем усяму свету сваю высокую грамадзянскую культуру, прыхільнасць нормам сапраўднага народаўладдзя», — падкрэсліваецца ў дэкларацыі.